Пачотная і адказная задача раённых і гарадскіх газет — шырэй і змястоўней асвятляць падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, больш увагі ўдзяляць пытанням агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў.

Газеты павінны аказаць вялікую дапамогу партыйным арганізацыям, акруговым і ўчастковым выбарчым камісіям у падрыхтоўцы і паспяховым правядзенні выбараў дэпутатаў ад заходніх абласцей БССР у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Добра зразумела гэту вялікую і адказную задачу гродненская газета „Свабодная Беларусь". Газета шырока асвятляе пытанні выбарчай кампаніі.

Ад 25 студзеня па 5 лютага „Свабодная Беларусь" прысвяціла шэсць перадавых артыкулаў і рад карэспандэнцый гэтаму важнейшаму палітычнаму пытанню. У перадавых артыкулах яна заклікае партыйныя, комсамольскія і грамадскія арганізацыі падрыхтаваць кадры агітатараў, шырока разгарнуць агітацыйна-прапагандысцкую работу не толькі на прадпрыемствах, установах, але і па месцу жыхарства выбаршчыкаў.

У сувязі з прадстаячымі выбарамі ўсё больш і больш шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва. Усё гэта знаходзіць месца на старонках газеты „Свабодная Беларусь".

Газета амаль у кожным нумары паведамляе чытачу аб павышэнні прадукцыйнасці працы на фабрыках і заводах, аб тым, як узятыя абавязацельствы рабочымі ператвараюцца ў жыццё.

Машыніст тав. Радзевіч М., працуючы на пасажырскім паравозе ОК-22 № 79, водзіць паязды па графіку і мае сістэматычны вагон на 20—40 мінут. Рабочы хлебакамбіната тав. Ясіноўскі раней выпякаў 2 печы хлеба, а зараз, у сувязі з падрыхтоўкай да выбараў, выпякае 3—4 печы.

Правільна зрабіла газета „Свабодная Беларусь", змясціўшы ў нумары 22 паласу „Гродна да прадстаячых выбараў," у якой паказваюцца дасягненні раёна ў галіне прамысловасці, народнай асветы, аховы здароўя, совецкага гандлю за час існавання совецкай улады.

Перад намі тры нумары бельскай газеты „Красная звезда". Гэтыя нумары паказваюць, што рэдакцыя сур'ёзную ўвагу ўдзяляе пытанням выбарчай кампаніі. На яе старонках асвятляюцца пытанні палітычнага і вытворчага ўздыму працоўных мас, газета агітуе канкрэтнымі фактамі.

У нумары 9 газета піша: „Толькі за адзін квартал на народную асвету па раёну адпушчана сродкаў у два з паловай разы больш, чым затрачваў польскі ўрад на народную асвету на працягу года.

Сець лячэбных устаноў за чатыры месяцы вырасла на 620 процантаў. Беднейшае сялянства атрымала 30 тысяч гектараў зямлі, якая раней належала памешчыкам і манастырам. 1200 бясконных сялян атрымалі коней. Беспрацоўным выдана 150 тысяч рублёў грашовай дапамогі. Пагарэльцам і беднаце выдана бясплатна 56 тысяч кубаметраў лесаматэрыялаў і інш."

Гэтыя лічбы красамоўна сведчаць аб тым, што партыя Леніна—Сталіна і Совецкі ўрад аказваюць вялікаю дапамогу рабочым і працоўнаму сялянству, вызваленым ад панскага прыгнёту.

Аднак, адзначаючы дадатныя бакі, патрэбна ўказаць на агульны недахоп работы гэтых газет, які выражаецца ў тым, што газеты абыходзяць пытанні практычнай работы прапагандыстаў і агітатараў, не паказваюць вопыту лепшых з іх. Рэдка з'яўляюцца на старонках газет артыкулы або карэспандэнцыі, асвятляючыя работу лепшых агіткалектываў на выбарчых участках, работу акруговых і ўчастковых выбарчых камісій.

Газеты „Свабодная Беларусь" і „Красная звезда" маюць усе магчымасці яшчэ глыбей і змястоўней асвятляць падрыхтоўку да выбараў.

А. Паплаўскі.



На здымку: сакратар Беластоцкага Райкома КП(б)Б М. Е. Акціпенка (справа) робіць інструктаж для агітатараў выязджаючых у вёску па правядзенню агітацыйна - масавай работы. (Фотахроніка БЕЛТА).

Прадвыбарчыя дні ў вёсцы

Апублікаванне ў друку Указа аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР сяляне нашай воласці сустрэлі з вялікім уздымам. За час існавання совецкай улады ў вёсках арганізаваны клубы, ленінскія куткі, адкрыта амбулаторыя, ёсць 5 кааператыўных лавак, звыш 1200 пайшчыкаў з укладам 19.000 рублёў. Дзеці сялян атрымлі магчымасць вучыцца на сваёй роднай мове. 200 га памешчыцкай зямлі раздана беднякам, 50 чалавек атрымалі кароў і коней.

У сучасны момант мы рыхтуемся да знамянальнага дня— выбараў у Вярхоўны Совет. Па нашай Одэльскай воласці створана 4 выбарчых участкі, для якіх ужо адведзены памяшканні. Адзін выбарчы ўчастак арганізаван у памяшканні воласці, другі—ў вёсцы Вайноўцы, у доме селяніна Івана Бакуновіча, два астатнія – ў школах. Зараз мы прыступілі да ўдакладнення і праверкі спіскаў выбаршчыкаў. Для гэтага ў кожную вёску пасланы актывісты воласці. У нас ёсць 10 агітатараў, якія праводзяць агітацыйна - масавую работу ў мястэчку Одэльску і ў вёсках. Варта адзначыць такіх агітатараў, як Нядзелін Еўгеній, Пелудзь Іосіф, Яцэл Софія, якія актыўна ўдзельнічаюць у прадвыбарчай кампаніі.

Сяляне нашай воласці ў дзень выбараў усе, як адзін, пойдуць да выбарчых урнаў і прагаласуюць за лепшых людзей народа, прадстаўнікоў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за людзей адданых справе партыі Леніна—Сталіна, справе народа.

І. А. Кандрусевіч
Старшыня валаснога камітэта Саколкаўскага раёна.

Комсамольцы -- актывісты выбарчай кампаніі

Актыўна ўключылася ў выбарчую кампанію гродненская гарадская арганізацыя ленінска-сталінскага комсамола. Каля 20 чалавек працуюць прапагандыстамі, членамі выбарчых камісій, агітатарамі. Яны ўмела нясуць большэвіцкае слова ў масы працоўных,

Па гораду ў 7 гуртках рэгулярна займаюцца 280 чалавек моладзі. Яны праяўляюць вялікую цікавасць да вывучэння Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Зараз комсамольская арганізацыя горада праводзіць работу па арганізацыі калектываў мастацкай самадзейнасці— драматычных, харавых, музыкальных і іншых.

Усяго створана 23 такіх калектывы, у якіх займаецца больш 240 чалавек.

Створаныя комсамольскімі арганізацыямі калектывы мастацкай самадзейнасці будуць абслугоўваць выбаршчыкаў у перыяд выбарчай кампаніі.

Гродненскі.

У КАЛГАСЕ ІМЕНІ ВАРАШЫЛАВА

Звярнуўшы з шасе, мы дагналі сялянскую фурманку. Мужчыны запрасілі нас пад'ехаць. Па дарозе разгаварыліся пра вёску Студзянкі. Гутарачы мы непрыкметна пад'ехалі да вёскі.

— Канцылярыя калгаса ў тым доме,—адказаў на наша запытанне малады мужчына.

Старшыні калгаса няма дома. Мужчын-калгаснікаў таксама амаль нікога няма дома. Яны на рабоце. Паехалі за лесаматэрыялам.

Калгаснікі рашылі пабудаваць кароўнік, канюшню, клуб, баню. Зараз усе мужчыны заняты на загатоўцы і вывазцы лесаматэрыялаў для будаўніцтва. Ужо вывезена 50 кубаметраў будаўнічага лесаматэрыялу.

Калгас атрымаў 110 гектараў ворыўнай зямлі, якая раней належала памешчыку і манастыру, і 60 гектараў сенажаці. Калгасу адпускаюцца сельскагаспадарчыя машыны і інвентар: 1 складаная малатарня, 2 сеялкі, 1 трыер, 2 веялкі, 10 конных плугоў, 1 касілка, 2 конных грабель.

...Нам расказалі, як раней жылося ў гэтай вёсцы. Сяляне жылі вельмі бедна. Больш 100 гектараў лепшай зямлі належала памешчыку і манастырам. Гэту зямлю арандавалі сяляне па 50—100 злотых за гектар. Беззямельныя не маглі арандаваць, бо не мелі грошай. У большасці сялян свайго хлеба нехапала.

Мужчыны зімой працавалі на лесараспрацоўках. Летам жанчыны і дзеці сабіралі грыбы, ягады, арэхі, прадавалі ў горадзе і за гэтыя грошы куплялі хлеб. За дазвол на права збору грыбоў і ягад плацілі памешчыку па два злотых.

Калгаснікі і сяляне вёскі Студзянкі зараз рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У вёсцы створан выбарчы ўчастак. Калгасныя агітатары Ігнатовіч Іван, Макарэвіч Юлія праводзяць гутаркі з сялянамі аб Сталінскай Канстытуцыі і выбарчым законе.

Г. Майскі

Члены выбарчых камісій у выбаршчыкаў

У памяшканні 51 выбарчага ўчастка Фабрычнай акругі сабраліся члены выбарчай камісіі і актывісты. Яны ўчора абышлі дамы выбаршчыкаў, каб правільна расставіць сілы агітатараў. У кожнага многа ўражанняў. Трэба падзяліцца з таварышамі па рабоце.

Рабочы скурзавода Кулеша абышоў 14 дамоў Фабрычнай вуліцы.

— Ва ўсіх сем'ях, — гаворыць ён, — абавязкова хто-небудзь працуе. Ва многіх працуюць па 2—3 чалавекі. У нас гэта раней было рэдкай з'явай.

Высвятляецца, што на Фабрычнай вуліцы няма дамоў 61 і 63. — Яны выходзяць на другую вуліцу, — павядамляе тав. Кулеша.

— Патрэбна яшчэ раз праверыць, у які ўчастак уваходзяць гэтыя дамы, — гаворыць старшыня камісіі тав. Уцеха і робіць у сябе адзнаку.

У доме № 69 жыхары розных нацыянальнасцей. Старшыня высвятляе, на якой мове там лепш праводзіць агітацыйную работу.

У невялікім доме № 59 адзін з кватэрантаў не плоціць гаспадыні кватэрнай платы, заявіўшы, што дом муніцыпалізаван. „Ці праўда гэта?" — спытала гаспадыня тав. Кулеша. Той ёй растлумачыў, што такія дамы не могуць належаць муніцыпалізацыі і што кватэрант павінен ёй плаціць кватэрную плату.

У адной сям'і ляжала хворая работніца-тэкстыльшчыца. У яе не было неабходных лекаў. Актывістка адзначыла гэту кватэру, каб высніць ва ўрача, чаму ён не выпісаў хворай лекаў.

У доме № 2, — расказала тав. Дзігкоўская, — 75-гадовы хворы старык цікавіўся, дзе ён будзе галасаваць. Я назвала яму адрас участка і спытала, ці не патрэбна будзе за ім прыехаць. Старык весела адказаў, што для выбараў ён не хворы і галасаваць прыдзе першы.

Падлік насельніцтва праведзен, сілы размеркаваны, заўтра агітары зноў пойдуць у дамы выбаршчыкаў.

В. Арэф'еў.

2) лица с высшим образованием;

3) выборные лица областных, уездных и городских органов самоуправления (про них уже говорилось выше);

4) члены правлений союзов промышленников, помещиков, ремесленников, а также христианских и пэпэсовско-бундовских профсоюзов.

Во всей Польше правом избирать в сенат могло пользоваться всего лишь 267 тысяч человек, менее 1 % населения. Округа по выборам в сенат насчитывали не больше 90—120 избирателей. Но и они не избирали своих представителей в сенат путем прямого голосования. Выборы были двустепенные, т. е. избиратели выбирали выборщиков, а выборщики составляли областную избирательную коллегию, которая опять-таки без прений, молча и не рассуждая, избирала сенаторов. Кандидатов в сенаторы выдвигала специальная комиссия в составе 15 членов областной коллегии.

Таков был избирательный закон в польский сейм и сенат. По этому закону проходили выборы в польский сейм и сенат в сентябре 1935 и ноябре 1938 года.

Независимо от избирательной системы решающую роль во всех выборах в Польше играли всегда административные власти, с министром внутренних дел во главе. Метод административного нажима, терроризирования избирателей и подлога результатов голосования широко применялся при всех выборах, в особенности со времени прихода к власти пилсудчиков. Методы эти применялись не только по отношению к революционным рабочим, которых по-просту арестовывали, избивали и ссылали в концлагерь, но и ко всем неугодным правящей клике элементам. Это было столь обычным явлением, что в польском языке создались и широко употреблялись особые обороты речи для обозначения выборов, проходящих под давлением государственной администрации «старостинские выборы», «чистые выборы» (ирония, — по аналогии с названием водки: «Чиста выборова»), «Чудеса над урной» и т. д.

Спецом по части «организации» польских выборов был генерал Фелициан Славой-Складковский, неоднократно занимавший пост министра внутренних дел, а в последнее время бывший также премьер-министром. Эти—одни из типичнейших представителей правящей в Польше военщины, тупой служака с фельдфебельской психологией, по-собачьи привязанный к Пилсудскому и слепо исполнявший его волю, а впоследствии раболепствовавший перед Рыдз-Смиглым. Он и подведомственные ему воеводы, старосты и коменданты полицейских постов принимали активнейшее участие в выборах: всемерно утрудняли агитацию оппозиционных партий, разгоняли их митинги, арестовывали агитаторов, заставляли служащих и учителей вести агитацию за правительственных кандидатов, устраняли невыгодных избирателей, угрозой увольнения рабочих и оштрафования крестьян, заставляли их голосовать вопреки их совести, подставляли своих людей для голосования за воздерживающихся, влияли на исход голосования путем подлога, подмены бюллетеней и т. д. и т. п.

Особенно решающе воздействовали административные власти на «волеиз'явление народа» в захваченных Польшей западных областях Белоруссии. Здесь с особенной силой свирепствовал террор полиции, произвол чиновников, социальный и национальный гнет. Здесь методы принуждения и подлога применялись воеводами и старостами полуявно, с бесстыдством колониальных завоевателей, с цинизмом самодержавных царьков. Даже польская печать с иронией писала о том, что крупные банкиры, промышленники, биржевики и генералы пользуются, очевидно, пламенной любовью полесских крестьян, так как получают в округах Пинской и Брестской областей куда больше голосов, чем в любом округе в Польше. Секрет этой любви не был ни для кого тайной. Усердие и рвение административных властей делало здесь и такие чудеса, что правительственные кандидаты получали даже... 120 процентов голосов избирателей. Этот результат голосования, прогремевший на всю Польшу, получился в одном из избирательных округов Брестской области.

Но даже генерал Славой-Складковский, с'евший зубы на «старостинских выборах» оказался бессильным, когда в 1935 году широчайшие массы всех населявших Польшу народов отказались принимать участие в комедии выборов по новому избирательному закону и предоставили пилсудчикам самим решать вопрос, кто из них удостоится лестного звания депутата и соответствующих этому званию окладов.

Результат голосования оказался для пилсудчиков плачевным. Не помог террор, угрозы и принуждение к голосованию. К избирательным ящикам не явилась по официальным данным половина избирателей, в Варшаве—70 процентов. В действительности, процент голосующих был куда ниже. В некоторых округах кандидаты вовсе не прошли, так как не получили законного минимума — 10 тысяч голосов. Подавляющее большинство населения сознательно уклонилось от голосования, демонстрируя таким образом свое отношение к существующему режиму и к новому избирательному закону. Польское телеграфное агентство в своем сообщении о результатах выборов, свалило всю вину за слабую явку на «неблагоприятные атмосферные условия», что вызвало понятно, смех в Польше и за границей.

Уродливый, каррикатурный сейм, избранный в этих выборах, пользовался всеобщей ненавистью в стране. Надо признать, что он со своей стороны делал все, чтобы пробуждать такие чувства к себе. В богатой галлерее подлых, продажных и трусливых буржуазных парламентов разных стран и времен не легко найти более лживое, гнусное, пресмыкающееся и холопствующее перед властьимущими и презрительно-заносчивое по отношению к народу собрание, чем польский сейм 1935 года. Этот траги-фарсовый парламент просуществовал три года, пока власти не убедились в его полной бесполезности для них и не решились, наконец, прогнать его и назначить новые выборы в 1938 году.

Учитывая опыт прошлых выборов, хитрецы из правительственного лагеря решили прибегнуть к маневру, чтобы во что бы то ни стало заманить народ к избирательным ящикам. Громогласно было об'явлено, что задачей нового сейма будет пересмотр избирательного закона. Правители Польши хотели перспективой демократизации положения о выборах, привлечь народ к голосованию...по старому избирательному закону.

Опыт прошлых выборов учли также административные власти. Нажим на избирателей усилился, особое внимание было обращено на решительное подавление агитации за бойкот выборов. Агитация за бойкот была об'явлена преступлением и каралась в судебном порядке. Всяческие листовки, призывавшие к бойкоту, конфисковывались. Одновременно власти развернули самую разнузданную антисемитскую и националистическую агитацию, призывая всех истинных поляков не уклоняться от голосования, ибо бойкот ослабляет мощь государства, является выдумкой жидов и прочих врагов Польши и проводится по «директивам из Москвы».

Польское правительство пыталось раскачать шовинистическую волну и захлестнуть ею оппозиционные массы. Совпавшее с кампанией выборов присоединение к Польше части Чешской Силезии было раздуто в крупнейшее историческое событие, величайшую победу Польши к результат гениальной, проницательной и дальневидной политики господ смиглых, мосьтицких, беков и Ко.

Выборы в 1938 году проходили, таким образом, в обстановке «левых» маневров, усиленного террора и подхлестывания националистическо - шовинистических настроений. Результаты голосования были для правящих кругов благоприятнее, чем предыдущие, но все же далеко неудовлетворительные. Голосовало—опять-таки по официальным источникам—2/3 избирателей.

Избранный в 1938 году польский сейм и сенат были последними по счету. Панская Польша, Польша складковских и беков, бесславно рухнула и развалилась в течение нескольких дней войны. Порабощенная польскими помещиками и капиталистами Западная Белоруссия освободилась при помощи доблестной Красной Армии. В безвозвратное прошлое отошли господа воеводы и старосты, их режим бесправия и террора, их лживая конституция и возмутительный избирательный закон. Над веками угнетаемым народом взошло солнце социализма, солнце новой, счастливой и свободной жизни. Наиболее демократическая в мире Сталинская Конституция призывает миллионы вчерашних бесправных рабов к политической активности, к управлению величайшим в мире государством.

День выборов в Верховные Советы СССР и БССР, знаменательный день 24 марта, покажет всему миру, как голосуют по своему глубочайшему убеждению освобожденные от ига польских панов и капиталистов народы западных областей Белоруссии.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ЛОНДАНСКАГА СОВЕТА ПРОФСАЮЗАЎ

Лонданскі совет профсаюзаў на сваім пасяджэнні 10 лютага аднадушна прыняў рэзалюцыю пратэста супроць кампаніі палітычных праследванняў ва Францыі. „Гэта кампанія, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — суправаджаецца мерапрыемствамі, амаль цалкам абмяжоўваючымі правы французскіх рабочых. Совет профсаюзаў заклікае англійскіх рабочых выступіць супроць крайне небяспечных рэакцыйных мерапрыемстваў французскага ўрада“.

Удзельнік пасяджэння Элот заявіў, што члены англійскіх профсаюзаў з трывогай адзначаюць такія факты, як закрыццё ў Парыжы 500 рабочых арганізацый, заключэнне ў турму сакратара парыжскага совета профсаюзаў Анры Рэйно і раду іншых профсаюзных кіраўнікоў.

Адзін з удзельнікаў пасяджэння прапанаваў паслаць у Парыж дэлегацыю, каб азнаёміцца са становішчам на месцы.

* * *

Лонданскі совет профсаюзаў прадстаўляе 330 тысяч рабочых, уваходзячых у найбольш вялікія профсаюзныя арганізацыі транспартнікаў, друкароў, машынабудаўнікоў і др.

(ТАСС)

Германская газета о подрывной деятельности Англо-Французского блока в Литве

Берлин, 12 февраля. (ТАСС). **Газета** «Рейниш вестфалише цейтунг» печатает следующее сообщение из Вильно: «Многие годы западные державы стремились использовать острую виленскую проблему для того, чтобы разжечь войну в Европе. В октябре прошлого года гор. Вильно был возвращен Литве. Это не понравилось Англии и Франции, которые одобрили еще 20 лет тому назад захват этого города Польшей. Последнее время Англия и Франция направили в Вильно своих агентов, которые использовали для своих целей находящихся там в большом количестве польских беженцев. Ядро мятежников состояло из студентов и преподавателей польского университета в Вильно. Польские священники также делали все возможное, чтобы разжечь вражду. Литовская полиция вовремя ликвидировала эти заговоры. Заявленный Англией и Францией по этому поводу протест, в котором они ссылаются на «плохое обращение с поляками», является вмешательством этих держав во внутренние дела Литвы. Наоборот, литовское правительство имело бы все основания протестовать против подстрекательских действий Англии и Франции. Литовский народ отклоняет решительным образом вмешательство западных держав в его дела. Уверенность Литвы в своей политике опирается на ее дружественные отношения с Советским Союзом и Германией».

З'езд амерыканскага маладзёжнага кангрэса

На з'ездзе амерыканскага маладзёжнага кангрэса, які адбываецца ў Вашынгтоне, выступіў Рузвельт. Як паведамляюць газеты, каля чатырох тысяч дэлегатаў кангрэса холадна сустрэлі прамову Рузвельта, асабліва ў той частцы, у якой ён дапусціў выпады супроць СССР.

Газета „Нью-Йорк таймс“ паведамляе, што калі Рузвельт пачаў крытыкаваць пазіцыі аднаго маладзёжнага цэнтра, адмоўна адносячагася да дапамогі белафінам, у зале спрабавалі нават асвістаць гэтую частку яго выступлення.

Затое шумнай авацыяй было сустрэта выступленне старшыні кангрэса вытворчых профсаюзаў Льюіса. Выступаючы супроць Рузвельта, Льюіс заявіў, што рэзалюцыі кангрэса моладзі і нядаўна адбыўшагася з'езда гарнякоў выказваюць апасенні, што некаторыя палітыкі ўцягваюць ЗША ў вайну. „Хто-ж мае больш права пратэставаць супроць вайны, — сказаў Льюіс, — як не моладзь, якая стане ў гэтым выпадку пушачным мясам“.

Льюіс прапанаваў склікаць 15 сакавіка аб'яднаны з'езд прадстаўнікоў Амерыканскай федэрацыі працы і кангрэса вытворчых профсаюзаў для абмеркавання пытання аб стварэнні адзінай арганізацыі профсаюзаў.

З'езд пазбавіў паўнамоцтваў некаторых дэлегатаў, імкнуўшыхся працягнуць рэзалюцыю з патрабаваннем выключыць комуністаў з кангрэса.

(ТАСС).

ТВОРЧАЯ НАРАДА

Днямі ў зале педінстытута адбылася нарада работнікаў культуры і мастацтва гор. Беластока, прысвечаная вынікам работы X пленума ЦК ВЛКСМ па пытанню падрыхтоўкі да алімпіяды дзіцячай творчасці.

З дакладам аб задачах школы ў галіне дзіцячай творчасці выступіў загадчык школьным аддзелам абкома комсамола т. Кашэнкоў. Тав. Кашэнкоў расказаў аб дапамозе, якую аказваюць дзіцячай самадзейнасці работнікі, майстры мастацтва Совецкага Саюза.

У абмеркаванні прынялі жывы ўдзел прысутныя на нарадзе работнікі мастацтва і культуры.

Тт. Дэгаль, Міцкун і іншыя звярнулі ўвагу на адсутнасць адпаведнага рэпертуара у школьных самадзейных гуртках, асабліва ў польскіх школах. Яны падкрэслівалі неабходнасць існавання драматычных гурткоў ва ўсіх школах, неабходнасць яшчэ большага разгортвання дзіцячай творчасці.

Дырэктар Дома Народнай творчасці тав. Бейлінаў заклікае майстроў мастацтва, артыстаў тэатра да прыняцця шэфства над дзіцячай самадзейнасцю.

У сваім выступленні сакратар абкома комсамола тав. Пічурэнка гаварыў, што комсамольцы разам з усімі іншымі арганізацыямі дапамогуць развіццю дзіцячых талентаў.

Нарада аднагалосна прыняла зварот да ўсіх работнікаў і майстроў мастацтва, у якім заклікае іх да работы над развіццём дзіцячай творчасці.

Рудзік.

СОЦИАЛЬНОЕ СТРАХОВАНИЕ В ЗАПАДНЫХ ОБЛАСТЯХ БССР

Государственное социальное страхование в СССР — одно из величайших завоеваний Октябрьской социалистической революции.

Сталинская Конституция прочно гарантирует каждому гражданину СССР право на материальное обеспечение в старости, а также в случае болезни и потери трудоспособности.

При этом социальное страхование осуществляется целиком за счет предприятий, учреждений и частных лиц, имеющих наемный труд. Сами рабочие и служащие полностью освобождены от каких либо расходов на социальное страхование.

Рабочие и служащие имеют также право на бесплатную медицинскую помощь.

С 1 января 1940 г. на всей территории западных областей Белоруссии и Украины действуют все законы, правила и нормы, установленные на территории СССР.

Для практической организации социального страхования в Белосток прибыла специальная комиссия ВЦСПС во главе с заместителем заведующего отделом социального страхования ВЦСПС тов. Н. М. Кац.

Б Белостоке начала свою работу совещание областных комитетов и Оргбюро профессиональных союзов Белостокской, Барановической, Пинской, Вилейской и Брестской областей. Совещание обсудит ряд практических организационных вопросов.

Для руководящих работников областных комитетов профсоюзов будет прочитан цикл лекций по государственному социальному страхованию приехавшим для этой цели, заведующим группой ВЦСПС тов. М. И. Лирцманом.

Специальные совещания будут проведены также с лечащими врачами и бухгалтерами профсоюзных организаций.

В ближайшие дни начнется учет и рагистрация предприятий и учреждений, обязанных вносить взносы на социальное страхование за своих рабочих и служащих.

В СССР застрахованные рабочие и служащие принимают деятельное участие во всей практической работе по социальному страхованию. С этой целью создан институт страховых делегатов и организованы советы и цеховые комиссии социального страхования.

В ближайшее время на предприятиях и в учреждениях западных областей Белоруссии начнутся выборы страховых делегатов и советов социального страхования.

Рабочие и служащие западных областей БССР с энтузиазмом включатся в новую для них общественную работу. Они по примеру рабочих и служащих всех других областей СССР приложат все усилия к тому, чтобы средства государственного социального страхования расходовались правильно, чтобы наше советское социальное страхование помогало трудящимся строить новую счастливую жизнь под солнцем Сталинской Конституции.

Н. А. Сорокин.



На резино - обувной фабрике бывш. «Ардаль» в гор. Лиде горздравом открыт пункт первой медицинской помощи.

На снимке: работница сортировочного цеха С. А. ГРИНШПАН на приеме у зубного врача М. М. ДРАЙКИНОЙ. (Фотохроника БЕЛТА).

ПО ГОРОДУ И ОБЛАСТИ

РАДИОПЕРЕДАЧА ХУДОЖЕСТВЕННОЙ САМОДЕЯТЕЛЬНОСТИ

15 февраля выступят перед микрофоном Белостокского радиоузла участники художественной самодеятельности белостокского областного Дома народного творчества. Это выступление будет транслироваться Барановичской и Минской радиостанциями.

Программа трансляции состоит из выступления хора Дома народного творчества в составе 150 человек под руководством тов. Шнеура, декламации на еврейском языке о Красной Армии (исполнитель: ученик 5 класса вечерней школы № 2 тов. Альтервейн) и концерта струнного оркестра под руководством тов. Гасса (русские народные песни).

НА БИРЖЕ ТРУДА

Растет число профессий, среди которых полностью ликвидирована безработица.

Кроме врачей, учителей, строительных рабочих, инженеров и техников строителей, инженеров и техников деревообделочников и рабочих полиграфической промышленности, среди которых давно уже нет безработных, сейчас нехватает также для удовлетворения поступающих заявок — поваров, пекарей и кочегаров.

НОВЫЕ ГОРОДСКИЕ СТОЛОВЫЕ

Конторой столовых, ресторанов и кафе открыта в Белостоке еще одна столовая (в помещении бывшего ресторана «Бристоль»). Новая столовая выдает в день от 300 до 400 обедов.

В ближайшие дни откроется столовая в бывшем помещении ресторана «Лунч», рассчитанная на 300 обедов в день.

Согласно решению горисполкома, не позже 20 февраля откроется большая городская столовая в помещении б. кафе «Люкс» на 250 мест.

ИЗВЕЩЕНИЕ

Окружная избирательная комиссия по выборам в Совет Национальностей Белостокского избирательного округа № 581 находится в помещении по ул. Толстого (б. Костельная) дом № 9, телефоны 14—76 и 16—34.

Председатель окружной избирательной комиссии.
Г. И. СЕМЕНОВ.

Адказны радактар
Б. М. Зельманаў

О борьбе с весенним наводнением и ледоходом
ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 91
Областного Исполнительного Комитета.

10. февраля 1940 г.

Белостокский Облисполком постановляет:

1) Для оперативного руководства борьбой с весенним наводнением и ледоходом в области создать областную комиссию под председательством:

а) Начальника областного Управления Милиции НКВД т. Алексеева в составе членов комиссии:

б) Нач. облдоротдела т. Мордаса,

в) Зав. областным отделом местной промышленности т. Грайвера,

г) Председателя Белостокского горисполкома т. Сенкевича,

д) Начальника Управления шоссейных дорог НКВД Белостокской области, т. Самцова,

е) Представителя гарнизона г. Белостока, т. Меньшова,

ж) Начальника Белостокского железно-дорожного управления, т. Бодунова.

Место нахождения комиссии в Управлении РК Милиции НКВД в г. Белостоке.

2) Обязать председателей райисполкомов создать районные и сельские комиссии, а также издать обязательное постановление по борьбе с ледоходом и весенним наводнением.

3) Обязать председателей райисполкомов обеспечить в кратчайший срок окончание ремонта и постройки ледорезов, а также устои мостов. Взять под систематическое наблюдение места, подверженные опасности наводнения и ледохода, обеспечив таковые при первой оттепели дежурством, за счет трудового участия населения в дорожном строительстве.

4) Обязать руководителей предприятий и учреждений беспрекословно представлять средства передвижения комиссиям по борьбе с ледоходом и наводнением при первом их требовании.

5) Предложить начальнику областной конторы связи дать распоряжение районтделам связи о представлении в первую очередь телефонных разговоров, связанных с ледоходом.

6) Предложить начальнику областного топливного отдела выделить областной комиссии по борьбе с наводнением и ледоходом 2 тонны бензина на расходы, связанные с ледоходом.

7) Выделить 2500 рублей из бюджета облисполкома в распоряжение областной комиссии по борьбе с ледоходом и наводнением.

8) Предложить областной комиссии по борьбе с наводнением и ледоходом разработать конкретные мероприятия по борьбе с наводнением и ледоходом и довести таковые до районов.

Председатель Белостокского Облисполкома **МАЛЬЦЕВ**
Секретарь **ЕГОРОВ**

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газэту прымае Саюздрук тэл. 5,14.
Упаўнаважаны абл. літа № 161
1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.